Ганна Хадасевіч

# Мікалай Пятровіч Царук – упраўляючы справамі маёнтка Замір’е ў першай трэці XX ст.

Дваццаць пяць гадоў гісторыі роду Святаполк-Мірскіх звязаны з сям’ёй Мікалая Пятровіча Царука. Сучаснікі памятаюць яго як гаспадарлівага ўпраўляючага справамі маёнткаў.

Прыход Мікалая Царука ў Мірскі замак на адказную пасаду не быў выпадковым. Яго яшчэ 15-гадовым юнаком прыкмеціў у Пецярбургу князь Міхаіл Святаполк-Мірскі, калі бываў там па справах дзяржаўнай значнасці. А калі князь даведаўся, што Мікалай Царук родам з мясцін з-пад Міра, то тым больш зацікавіўся і сачыў за тым, як разумеў эканамічныя навукі Мікалай, як развіваліся яго погляды і адносіны да ўсяго, што адбывалася ў пачатку XX ст. у кіпучай сталіцы Расійскай імперыі. Гады вучобы і працы ў Санкт-Пецярбургу шмат чаму навучылі Мікалая Пятровіча. Аднак аб родным краі заўсёды помніў. Калі ім даводзілася сустракацца з князем у царскім “Яхт-клубе”, Мікалай шчыра імкнуўся даведацца аб жыцці ў родных мясцінах, бо там засталіся родныя і сябры.

Нарадзіўся М.П. Царук у 1886 г. у в. Вялікая Вобрына, 12 км ад мястэчка Мір Навагрудскага павета. Ён быў другім па старшынству сынам Пятра і Ганны Царукоў. Больш за ўсё бацькі марылі даць адукацыю дзецям, але не хапала сродкаў. Вельмі рана страціў маці, а ў сям’і было яшчэ 3 браты і 3 сястры. Родны брат бацькі Сямён Дамінікавіч Царук забраў 16-гадовага пляменніка ў Санкт-Пецярбург, даў магчымасць прадоўжыць вучобу. Мікола пасля школы закончыў слынную бухгалтарскую школу па курсу Езерскага. У вольны ад вучобы час працаваў у банку, а таксама дапамагаў дзядзьку Сямёну ў царскім клубе. Паколькі дзядзька быў чалавекам дзяржаўным, ён добра разумеў, што мужчына павінен авалодаць і навыкамі ваеннага майстэрства, а таму калі прыйшоў час, Мікалай Царук прыступіў да ваеннай службы – спачатку у Арэнбургу, а потым у Пецергофе: праходзіў 3-гадовую школу афіцэраў. Восем гадоў сталічнага жыцця заклалі надзейны фундамент ведаў, а таксама – што не меней важна – добрую школу жыцця.

Асабістыя якасці і прафесійныя здольнасці Мікалая Пятровіча не мог не заўважыць дыпламат і палітык князь Міхаіл Святаполк-Мірскі, які дбаў аб тым, у якія рукі даверыць эканамічныя справы ў Міры.

Прапанову князя заняць пасаду бухгалтара Мікалай Царк прыняў. Дзядзька Сямён адобрыў такое рашэнне. Ён жадаў, каб пляменнік эканамічныя веды накіраваў у практычнае русла. Тым больш у родных мясцінах. У той час у Санкт-Пецярбургу было вельмі неспакойна. Маладыя людзі не зусім свядома ўключаліся ў палітычныя групоўкі ці арганізацыі. Дзядзька Сямён імкнуўся адгарадзіць пляменніка і ад палітычнага ўплыву

сталіцы. У гэтай сям'і прыярытэты заўсёды аддаваліся справам гаспадарчым, эканамічным, адукацыйным. І Мікалай Пятровіч усё сваё жыццё прытрымліваўся гэтага правіла.

З 1908 г. па 1928 г. жыццё і дзейнасць М.П. Царука звязана з Святаполк-Мірскімі. Вярнуўшыся на радзіму, Мікалай сустрэў сваё каханне – Анастасію Іванаўну Паўловіч. У 1912 г. яны пажаніліся.

Гісторыя гэтай дзяўчынкі была не менш цікавая і складаная. Іх лёсы нават у нечым падобныя. У 14 гадоў яна засталася без маці. Паколькі была старэйшай у сям'і, то павінна была клапаціцца і аб малодшых – Марыі і Ганне. Калі аднойчы мачаха (другая жонка бацькі), пакуль бацька быў у полі, адправіла дзяўчынак на "свой хлеб" – бесчалавечна выгнала з дому, – Анастасія, узяўшы малодшых за ручкі, змагла пераадолець з імі 15-кіламетровы шлях ад Задзвеі да Міра за светавы дзень. Яны не ведалі, куды ім падацца далей і селі адпачыць, а можа і пераначаваць на беразе прыгожага возера ў Міры. У час вячэрняй прагулкі княгіня Клеапатра заўважыла незвычайных спадарожніц і зацікавілася, як яны апынуліся тут на ноч гледзячы. Насця падзялілася сваімі праблемамі, і ім далі начлег. З цягам часу гэтая працавітая і чулая дзяўчынка стала самай дарагой і надзейнай апорай для адзінокай і безнадзейна хворай княгіні-прыгажуні Клеапатры. Больш яны ніколі не расставаліся.

Калі сям'я Святаполк-Мірскіх ехала на адпачынак у Любацін (дача пад Харкавам), Балгарыю ці Адэсу, заўсёды бралі з сабой Насцю, Маню і Анюту. Да апошніх дзён жыцця Клеапатра не разлучалася з Анастасіяй. Вельмі прасіла дагледзець у апошнія хвіліны жыцця. З вялікай павагай, спачуваннем і бязмежнай удзячнасцю адносілася дзяўчынка да княгіні Клеапатры. Гэтыя гады былі сапраўдным універсітэтам жыцця. Дзяўчына была пытлівая, здольная, неабыякава ставілася да эканамічных пытанняў маёнтка.

Калі ў Святаполк-Мірскіх пасаду бухгалтара заняў малады, прыгожы, адукаваны, інтэлігентны Мікалай Пятровіч Царук, Анастасія Іванаўна Паўловіч ужо нядрэнна валодала пытаннямі гаспадарчага і эканамічнага парадку.

Некалькі гадоў княгіня Клеапатра была ўдавой, страціла любімага мужа, безнадзейна хварэла сама. Адказнасць за стан усіх спраў у Міры ўзваліў на свае плечы Міхаіл Святаполк-Мірскі. Упраўляў справамі гаспадарчымі ў яго час Франклін, італьянец па паходжанню. Ён нядрэнна прыжыўся ў Міры, але заўчасна памёр, і справы ўпраўляючага былі даверany Мікалаю Пятровічу Царуку. Да 1928 года Мікалай Пятровіч з вялікай адказнасцю прымяняў свае тэарэтычныя веды, праяўляў свае прыродныя здольнасці. Але за гэтымі справамі стаялі не толькі будынкі, але і людзі, чалавечыя лёсы з іх просьбамі і праблемамі. Патрэбна было своечасова арганізаваць працу ў полі, наладзіць парадак у лясах, разлічыцца з людзьмі. Усе мелі ў чымсьці патрэбу. Прасілі не ў князя, а ў упраўляючага. Хто прасіў

пазычыць грошай, хто хлеба, хто фуражу. Даводзілася часта проста на даверы будаваць адносіны з простым людам. Тут часта добрай дарадцай Мікалая Пятровіча выступала Анастасія Іванаўна, бо не па чутках і кнігах зведала яна цяжкасці жыцця, ды і пытаннямі гаспадарчых спраў валодала не звонку, а з самага "сэрца" замкавых спраў. Тым больш, што ў 1912 годзе Мікалай і Анастасія пажаніліся, абвянчаліся ў царкве Узнясення Гасподняга ў в. Ярэмічы, дзе ў свой час хрысцілі Мікалая Царука. Дарэчы, гэтая царква і сёння дзейнічае, а яе фундатарам з'яўляецца дачка Анастасіі і Мікалая Царукоў Клеапатра, названая ў гонар княгіні Мірскай. Сама княгіня, на жаль, не дажыла да вяселля сваёй любіміцы, прыемнай дачкі Насценькі. Але князь Міхаіл даў маладой сям'і ўпраўляючага прыстойны дом. Гэты двухпавярховы белы дом патанаў у зелені прыгожага парку. Ён і сёння ў Міры завецца "белым домам". У гэтай дружнай і працавітай сям'і нарадзілася і выхавалі чацвёра дзяцей: два сыны – Сямён 1913 г.н., Аляксей 1916 г.н. і дзве дачкі – Вольга, 1920 г.н. і Клеапатра 1923 г.н. Бацькі вельмі клапаціліся аб выхаванні і адукацыі дзяцей.

Аб сістэме выхавання дзяцей у сям'і Царукоў успамінае дачка Мікалая Пятровіча Клеапатра Мікалаеўна: "...Усе хатнія справы ляжалі на плячах мамы. Але ў кожнага з нас, чацвярых дзяцей, былі свае абавязкі ў залежнасці ад узросту. Самага старэйшага Сямёна, калі ён яшчэ вучыўся ў Нясвіжскай семінарыі і прыязджаў на канікулы, бацькі накіроўвалі на нарыхтоўку лесу непадалёку ад Міра. Стомленым вяртаўся пасля працоўнага дня 13-гадовы юнак. Бацькам шкада было сына, але яны былі ўпэўнены, што гэта добрая школа жыцця. Тым больш, што Сямён рос вельмі актыўным хлапчуком. У час канікул ён сябраваў з адным з пляменнікаў князя Міхаіла Святаполк-Мірскага. У князя заўсёды было шмат сваякоў, ён нават дом для іх спецыяльны пабудаваў. (Сёння гэты будынак – адзін з карпусоў Мірскай участковай бальніцы).

У Міры было два тэлефоны. Адзін быў у распараджэнні князя Міхаіла, другі – у нашым доме (упраўляючага справамі маёнтка князя). Толькі па важных справах дазвалялася карыстацца тэлефонам, бо гэта каштавала грошай. Нас з дзяцінства, памятаю, вучылі, быць эканомнымі.

Аляксей быў другім сынам у сям'і. Нарадзіўся ў 1916 г. у г. Любацін пад Харкавам. Туды Царукі выехалі ў час эвакуацыі ў гады Першай сусветнай вайны разам з роднымі князя. У Любаціне была адна з дальніх дач Святаполк-Мірскіх. Дык вось, Аляксей з дзесяці гадоў працаваў у полі, як дарослы. Добра ўмеў касіць, баранаваць, араць зямлю. Увіхаўся у час жатвы. Вельмі любіў лён апрацоўваць. Бо ўсе мы, дзеці, усвядомілі, калі мама пасля здачы апрацаванага льну атрымае грошы, адразу ласункі купляла як узнагароду кожнаму. Мы ж са старэйшай сястрой Вольгай, на тры гады старэйшай за мяне, адказвалі за парадак у пакоях. У нашы абавязкі ўваходзіла вільготная ўборка падлогі, а перад абедам накрыць на стол,

дапамагаючы маме. Бо калі на абед прыязджаў тата, ён у кожнага патрабаваў справаздачу, кожнаму меў знайсці патрэбнае слова, вельмі запамінальныя рэчы гаварыў. Мне здаецца, што найбольш пяшчотна ён адносіўся да мяне. Цяпер я разумею: бо я была самая малодшая ў сям'і. Больш грунтоўная, падрабязная справаздача, з улікам ацэнкі нашых спраў з боку мамы, адбывалася за вячэрай. Усе мы да гэтага адказнага моманту ставіліся сур'ёзна. І калі тата аднойчы даведаўся, што старэйшы сын Сямён з пляменнікам князя выкарыстоўваюць службовы тэлефон не па прызначэнню, а для дзіцячых свавольстваў, то паміж ім і Сямёнам адбылася сур'ёзная размова. Умовы былі пастаўлены, і два разы бацьку гаварыць не даводзілася.

Трэба шчыра прызнаць і тое, што мы, дзеці, не былі пазбаўлены і дзіцячых свавольстваў. Памятую, што ў нашым доме было вялікае сховішча для яблыкаў у цокальным памяшканні. І старэйшыя дзеці заўсёды тайком ад дарослых запускалі туды мяне, як самую шчуплую і малую, ды ўсе разумелі – з мяне і спыт меншы будзе. Я праз акенцы яблыкі выдам, усе задаволеныя разбягуцца, забыўшы пра мяне, а я сяджу і плачу, пакуль хто з дарослых не пачуе, ды не дапаможа выйсці. Колькі ж мне тады было: 4–5 гадоў.

Праходзім праз двор былога дома і Клеапатра Мікалаеўна дакладна паказвае тыя акенцы, праз якія падавала яблыкі. Прайшлі ў бок парка, 20 метраў ад дома і спыніліся каля невялікага збудавання, дзе абваліўся дах. І зноў прыйшлі ўспаміны: Тут у нас было памяшканне для захоўвання прадуктаў харчавання ўлетку. Халадзільнікаў у той час не было. Ранняй вясной з возера рэзалі лёд і насілі сюды. Тут і захоўваліся прадукты.

Бацькі ўмелі знайсці педагагічна правільны падыход да нас. Я часта выкарыстоўвала сама іх методыку выхавання, калі расла мая дачка. Хоць у нас з мужам яна была адзіная, мы выхоўвалі яе ў строгасці, выхоўвалі пачуццё адказнасці і працавітасць. Нават бабцы Анастасіі не дазвалялася песціць сваю любімую ўнучку, – Клеапатра Мікалаеўна міла ўсміхнулася і дадала: Можа наша методыка выхавання, перанятая ад бацькоў, і дапамагла маёй дачцэ, якая нарадзілася ўжо ў Вялікабрытаніі. Не будучы англічанкай па паходжанню, яна атрымала "Ордэн Вялікабрытаніі" – высокую ўзнагароду ад каралевы Елізаветы ІІ за працоўныя дасягненні ў праваахоўных органах. Дарэчы, і муж Конрад Зіманд, паляк па паходжанню, у 2000 г. адзначаны каралевай Елізаветай ІІ ордэнам "Член Брытанскага каралеўства. – І зноў усміхаецца і дадае: Відаць, і мужа выхоўвалі добра. Спрацавала дзедаўская методыка выхавання і ў Вялікабрытаніі, куды нас закінуў лёс.

– Клеапатра Мікалаеўна, а якім у Вашай памяці паўстае вобраз князя, ці памятаеце?

– Так, вельмі добра памятаю. Я ўзгадваю, як ён літаральна кожную раніцу, а восьмай гадзіне, з вялікай колькасцю сабак (6 ці 8) хадзіў у парк на прагулку. Ён выглядаў вельмі адзінокім чалавекам. Заўсёды быў у ярка-чырвоным халаце, накшталт піжамы, і меў бараду, як мне здавалася, доўгую

белую. На мяне гэта, скажу шчыра, наганяла жах і я бегла дадому, хацелася схавацца. А на самой жа справе, князь быў вельмі ветлівы, прыстойны, спакойны. Ён любіў у час прагулак зайсці да нас, абмеркаваць з мамай наспеўшыя пытанні. Бывала, сустракаўся з сваім поварам. Яго повар меў асабісты пакой у нашым доме.

Мама заўсёды прапаноўвала князю выпіць гарбаты. Ён, бывала, прымаў прапанову, а іншы раз ветліва адмаўляўся. Князь быў высокаадукаваным і выхаваным чалавекам. Валодаў некалькімі ўсходнімі мовамі. Часта свае прагулкі па парку суправаджаў мастацкім свістам. Мы дзівіліся, як у яго гэта ўдала атрымліваецца.

Тыя жыццёвыя клопаты і праблемы, з якімі сутыкаліся ў першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя ў беларускіх губернях Расійскай імперыі, былі характэрныя і для жыццёвых і гаспадарчых спраў Святаполк-Мірскіх. Рэзка абвастрыліся сацыяльныя супярэчнасці, узмацнілася барацьба сялян за зямлю. Асабліва выразна гэта праявілася на хвалі першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. Нават у Міры для кіраўніцтва забастоўкамі сялян быў створаны забастовачны камітэт. Найбольш распаўсюджанай формай незадаволенасці сялян сталі забастоўкі пастаянных і падзённых рабочых. Сяляне Мірскай воласці адмовіліся хадзіць на жніво да памешчыкаў. Такое становішча назіралася і ў іншых маёнтках Святаполк-Мірскіх – Гарадзеі, Ушы, Малеўцы. У полі застаўся нязжаты ўраджай азімых. Агітацыйную работу сярод сялян вялі запасныя ніжнія чыны, якія вярнуліся з руска-японскай вайны. Толькі ў 1907–1910 гг. стаў назірацца спад сялянскага руху. Трэба адзначыць, што канфлікты ўзнікалі часта не столькі з-за нежадання рабіць своечасовыя разлікі за працу, колькі з-за немагчымасці. Сказваліся неўраджаі і прыродныя стыхіі, што таксама мела месца. Вось так сведчыць факт з успамінаў. “Прыйшоў аднойчы ўсхваляваны і расчараваны працаўнік маёнткаў Святаполк-Мірскіх, іншаземец па паходжанню, з акцэнтам гаварыў па-руску. Звяртаецца да жонкі ўпрауляючага: Анастасія Іванаўна, бяда-бяда, аўса прапала. – Ну, што там, аўца не прападзе, прыйдзе да стада. – Дык не, Анастасія Іванаўна, уся аўса прапала, ад Гарадзеі да Міра. Бяда-бяда такая!” Толькі тады зразумела Анастасія Іванаўна, што гаворка ішла не пра аўцу, а пра авёс, што быў пабіты градам і ліўнямі на вялікай плошчы. Вось такі ўрон нанеслі прыродныя з’явы гаспадарцы. Упраўляючы часта ўладкоўваў канфлікты на ўзроўні асабістых дамоўленасцей, узяўшы крэдыт даверу.

Вялізнае бедства прынесла беларускаму народу Першая сусветная вайна. Асабліва ў цяжкім стане аказаліся жыхары тых паветаў і валасцей, якія доўгі час былі ў прыфрантавай паласе. Прычым, паласа на 5 км па абодва бакі расійска-германскага фронту стала зонай ваенных дзеянняў. Артылерыйскія абстрэлы, перамяшчэнне і кватэраванне салдат, мабілізацыя мужчын у войска, рэквізіцыя жывёлы парушалі рытм мірнага жыцця. Не хапала працоўных рук, што неспрыяльна сказвалася на стане сельскай

гаспадаркі. Гэта ўсё прывяло да напаўгалоднага стану тых, хто не выехаў за межы родных мясцін. Не стала выключэннем і сям'я Святаполк-Мірскіх: не ў ліку першых яны пакінулі Мір. Аднак сам Мікалай Пятровіч Царук не дазволіў сабе пакінуць без догляду ўсю гаспадарку давераных яму маёнткаў. Адправіўшы ў Любацін (каля Харкава) 2-гадовага сына Сямёна і цяжарную другім дзіцяткам жонку, не без хвалявання застаўся ў Міры. На жаль, ваенныя падзеі Першай сусветнай вайны не абмінулі Мір – падчас эвакуацыі шмат чаго было страчана. Што было магчыма вывезлі з сабой (зразумела, што гэта быў мізэр), а шмат чаго разрабавалі акупанты. Бо ў выніку выступлення кайзераўскіх войск у верасні 1915 года фронт стабілізаваўся на р. Сэрвач. Гэта азначала, што тры гады палова Карэліцкай зямлі знаходзілася пад акупацыяй, пад ваенным упраўленнем так званых этапных інспекцый. Шматлікія загады, распараджэнні акупацыйных улад строга рэгламентавалі ўсе жыццё мясцовага насельніцтва. Без дазволу ўлад забаранялася свабодна перамяшчацца з аднаго населенага пункта ў другі, нават наведваць царкву, быў шэраг пэўных абмежаванняў. Грамадзянін павінен быў мець пасведчанне асабовае. Так, на адвароце фотаздымка быў надпіс "Изображенная на сей карточке личность есть управитель имения Замирье Мирской волости Новогрудского уезда Николай Петрович Царюк, в чем удостоверяю с приложение земской печати апреля 19 дня 1917 г. Уездный комиссар, председатель Новогрудской земской управы, подпись". Без наяўнасці такога дакумента  ўпраўляючы не змог бы перамяшчацца з аднаго маентка ў другі. Акупанты пастаянна патрабавалі паставак мяса, малака, сыра, яек. Падаткавы цяжар быў значна большы чым пры царызме. Тых, хто ўхіляўся ад прымусовых работ, падвяргалі штрафу ў памеры да 1000 марак ці турэмнаму зняволенню, нават фізічным здзекам. За тры з лішнім гады нямецкі акупацыйны рэжым яскрава паказаў свой каланіяльны характар і свае грабежніцкія мэты ў адносінах да насельніцтва і яго нацыянальных каштоўнасцей. Безумоўна, гэта выклікала абурэнне і нянавісць да акупантаў. Толькі рэвалюцыйныя падзеі у Расіі, а затым у Германіі вызвалілі беларускае насельніцтва і яго землі ад акупантаў. З аптымізмам вярталіся бежанцы ў родныя мясціны з надзеяй прыступіць да мірнага жыцця. Вельмі цяжка аднаўленчыя працэсы ажыццяўляліся ў маентках Святаполк-Мірскіх. А хутка пачаліся новыя выпрабаванні – гады белапольскай акупацыі. Гэта новыя і балючыя аспекты і старонкі гісторыі роду Святаполк-Мірскіх.

Памятаю, як мы з сястрой Вольгай імкнуліся быць падобнымі да сваіх бацькоў. Калі мама перад Вялікоднымі святамі купіць ласункаў, то нам заўсёды хацелася пачаставаць дзяцей-аднавяскоўцаў, бывала яшчэ задоўга да свята.

З успамінаў кучара Ксаверыя Дзям'янкі: "Я вазіў Мікалая Пятровіча 3 гады. Вельмі прыстойны быў чалавек, добры, ветлівы і чулы да людзей. Прыйду зранку, перш-наперш накіруе да гаспадыні, каб паснедаў. А

гаспадарлівасці яго да сённяшняга часу дзіўлюся. Вось бы сёння нам такіх гаспадароў сюды, у калгас, дык напэўна быў бы толк большы. Вельмі дбаў пра людзей. Часта здаралася, што нехта да новага ўраджаю дацягнуць не можа і купіць няма за што, то заўсёды Мікалай Пятровіч выслухае і выйсце знойдзе. А потым скажа: "Ідзіце да маёй Анастасіі Іванаўны, яна дапаможа".

– Клеапатра Мікалаеўна, якім вы ўспамінаеце свайго бацьку як упраўляючага?

На падставе тых фактаў, якія памятаю, магу зрабіць высновы з пазіцый сённяшняга разумення. Добра памятаю, што перыядычна тата і мама запрашалі нашага дзядулю Пятра да нас у Мір. Ён жыў у нас 2–3 тыдні. Мы вельмі чакалі дзядулю. Ён шмат часу праводзіў з намі, расказваў пра нашы карані, вучыў з намі малітвы. Калі дзядуля ў нас гасціў, то рабочыя мірскага спіртзавода, які размяшчаўся літаральна за плотам нашага дома, лічылі неабходным пачаставаць бацьку ўпраўляючага спіртам. Пры гэтым жа, безумоўна, і самі частаваліся. Гэта паўтаралася неаднойчы, заўважыла мама і адразу ж праінфармавала тату. Увечары, паважаючы ўзрост дзядулі, тата спакойна сказаў: "Тата, ты ж разумееш мой стан і гэта сказваецца, па-першае, на дысцыпліне, а па-другое, на заробку гэтых людзей. Што я ад іх буду патрабаваць, калі з імі быў мой родны бацька? Іх трэба адхіліць ад працы ў гэты дзень". Дзядуля вінавата тлумачыў, што ён не згаджаўся, аднекваўся, але не хацеў, каб гэтыя людзі ўспрынялі гэта як знявагу. Толькі гэты аргумент некалькі супакоіў тату.

Тата вельмі па-добраму, з разуменнем і чуласцю адносіўся да людзей. Памятаю, ён маму заўсёды клікаў "Насценька". Неаднойчы маме гаварыў: "Насценька, паглядзі, што там у нас ёсць з адзення дзіцячага ці харчовых прадуктаў, што можна аддаць каму-небудзь". Не хацеў, каб нешта ляжала без патрэбы. Мама аператыўна праводзіла "рэвізію", бо было шмат людзей, хто меў тэрміновую неабходнасць у гэтым.

Вялікія фінансавыя, матэрыяльныя цяжкасці былі ў князя. Ён увесь час турбаваўся, як падняць узровень замка і наладзіць гаспадарчыя справы. Гэта было неад'емнай часткай і спраў упраўляючага. Яго веды, інтуіцыя, уменне весці дыялог з людзьмі – вось што неаднойчы дапамагала выйсці з цяжкага стану.

Падзеі ваенных гадоў польска-савецкай вайны ўскладнялі сітуацыю. Летам 1920 года давялося пакінуць межы Міра і эвакуіравацца ў Польшчу, жылі недалёка ад Варшавы.

Царук не жадаў і не мог пайсці на кампраміс, калі гэта не адпавядала яго прынцыпам вядзення гаспадарчых спраў. Ён паважаў дысцыпліну і беражлівасць, быў патрабавальны як да сябе, так і да акружэння, а калі падзеі сталі развівацца ў такім напрамку, што казна бяднела, не было чым разлічвацца, то і вынікі такой працы не маглі яго задавальняць.

Пасля таго, як у ліпені 1925 г. польскім сеймам быў прыняты “Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы”, палітыка парцэляцыі і камасацыі ў заходнебеларускім рэгіёне стала рэальнай з’явай, Мікалай Пятровіч і Анастасія Іванаўна Царукі купілі зямлю і ўсталяваліся з сям’ёй на хутары ў 1,5 км ад в. Вялікая Вобрына, радзімы Мікалая Пятровіча. Родныя і аднавяскоўцы называлі гэты хутар “Мікалаеўка”. Мікалай Царук яшчэ працягваў працу ў Міры, але з 1928 г. канчаткова перабраўся з сям’ёй на хутар.

Князь Міхаіл неаднойчы звяртаўся яшчэ за парадамі да былога ўпраўляючага і нават у 1932 і 1934 гг. прасіў яго вярнуцца ў Мір, але Мікалай Пятровіч не мог даць згоду і прыняць прапанову князя. Ён ужо быў упраўляючым маёнтка Кашыцаў, паблізу ад свайго ўласнага хутара, у жывапісным парку з шматвекавымі дубамі, піхтамі, ліпамі. На беразе возера размяшчаўся цудоўны палац радавога маёнтка Кашыцаў. Тут было дзе праявіць свой вопыт і веды. Што яшчэ падштурхнула Мікалая Царука застацца тут – гэта заўчасная смерць былога ўпраўляючага, даўняга сябра сям’і Царукоў Сідаровіча і як абяцанне і абавязак – працягнуць справу сябра. Поле для дзейнасці было шырокае.

Трыццатыя гады ў жыцці Міхаіла Святаполк-Мірскага не былі лёгкімі ва ўсіх адносінах. У 1938 годзе з Румыніі прыязджае яго пляменнік Аляксандр. Адукаваны чалавек працаваў суддзёй у Румыніі. Жонка была з-пад Познані. Афіцыйна князь Міхаіл усынавіў Аляксандра, што надало яму статус нашчадка.

У ліпені 1938 года князь Міхаіл памёр. Труну з целам прывезлі з Варшавы. Усе жыхары Міра і акругі былі ў жалобе. Ксёндз адпраўляў памінальную паніхіду, а потым жалобная працэсія перамясцілася ў фамільную капліцу (магільны склеп) Святаполк-Мірскіх.

Пахаванне правёў праваслаўны святар, мясцовы бацюшка.

– Клеапатра Мікалаеўна, сталыя жыхары Міра памятаюць, што ў часы князя Аляксандра ўпраўляючым зноў быў Царук?

Так, сапраўды, тата вярнуўся ў Мір. Справа ў тым, што князь Аляксандр звярнуўся з просьбай да маёй мамы Анастасіі Іванаўны паўплываць на рашэнне таты, каб вярнуцца ў Мір. Аляксандр бываў у Міры, бачыў і ведаў маіх бацькоў у справе, іх шчырыя адносіны да княжацкіх спраў не былі не прыкмечаны. Тым больш, што ён яшчэ ў малым узросце прыязджаў да бабкі-княгіні Клеапатры, у час адпачынку за межамі Міра сустракаліся (мама ж была заўсёды разам з княгіняй. Яна як дачка была для княгіні. І трэба сказаць, што выканала просьбу княгіні Клеапатры: заставалася разам з ёй у цяжкія перыяды яе жыцця і хваробы).

Князь Аляксандр, напэўна, разлічваў, што сям’я Анастасіі Іванаўны не можа абыякава ставіцца і да яго спраў. Ён папрасіў тату дапамагчы яму вывесці справы ў Міры з крызісу, падняцца з каленяў. І ў сакавіку 1939 г.

Мікалай Пятровіч самааддана прыняўся за справы ўпраўляючага. Стан быў крытычны. Але яго вельмі ветліва сустрэлі людзі, яны разлічвалі на яго. Нават яўрэі (іх у Міры было шмат) прыйшлі да Мікалая Пятровіча і вельмі даверліва прапанавалі крэдыты, сваю дапамогу, але з агаворкай, калі застанецца ўпраўляючым назаўсёды. Тата не ведаў, які працяглы тэрмін будзе ён на пасадзе. І фінансы рэальныя бачыў. Таму і прапанову прыняць не мог. Але за давер падзякаваў. Яны таксама жадалі, каб справы ў Міры наладзіліся.

Вельмі добрыя адносіны былі паміж князем Аляксандрам і ўпраўляючым Мікалаем Пятровічам. Але, на вялікі жаль, лёсам не было наканавана выправіць справы, аднавіць замак, здзейсніць спрадвечную мару Святаполк-Мірскіх.

Усе перамянілася, радыкальныя змены ўнеслі падзеі 17 верасня 1939 года. Князь Аляксандр з сям’ёй быў дэпарціраваны ў Сібір...

Пасля ўжо доўгі час яны з жонкай, а пасля і іх дзеці пісалі да мяне з Іспаніі. У першай палове 90-х перапіска спынілася.

Трагедыя закранула многія сем’і, не абышла бокам яна і нашу сям’ю. Безумоўна, не па асабістым жаданні я апынулася за межамі Радзімы.